*Сам сабе рэжысёр*

# ЗМЯНІЦЬ ЛЁС ГАЛОЎНАГА ГЕРОЯ,

## ці Адкуль бяруцца фанфікі



**Гэтае паняцце ўтварылася ад англійскага fan fiction (фан-літаратура), што азначае аматарскую варыяцыю па матывах любога арыгінальнага твора: кнігі, фільма, серыяла, мультфільма, комікса, камп'ютарных гульняў. Менавіта па іх і складаецца новая ідэя, дзе аўтар можа без правілаў і абмежаванняў надаць любыя рысы абранаму персанажу, зрабіць яго цёмнавалосым або бялявым, ажаніць з кім заўгодна, вырашыць, будзе канец гісторыі шчаслівы альбо не. Усе фанфікі акумулююцца на сайце «Фікбук», дзе кожны ахвотны можа апублікаваць сваю работу, устанавіць зваротную сувязь са сваімі чытачамі. А карыстальнікі на ім аб'ядноўваюцца ў нефармальныя суполкі, якія цікавяцца якой-небудзь адной тэмай: з серыяла, кнігі, фільма і г. д.**

**Цікава, а як чалавек пачынае пісаць фанфік і якой мэтай кіруецца, калі са «старога» стварае новае? Аб гэтым і не толькі нам расказала Алена АСТАПОВІЧ. Дзяўчына захапляецца фанфікамі ўжо даўно.**

***— З чаго пачалося тваё знаёмства з імі?***

— Свой першы фанфік я напісала ў 12 гадоў, прычым не ведала, што гэта так называецца. Калі чарговы раз пераглядала «Гары Потэра», абуралася, бо не разумела, чаму ў фільме не ўдзяляецца належнага часу раскрыццю ўзаемаадносін Альбуса Дамблдора і Мінервы Макгонагал. Я была ўпэўненая, што яны былі б добрай парай. Менавіта таму пачала ствараць сваю гісторыю іх кахання. У сшытку накідала літаральна старонку тэксту, зрабіўшы сюжэт такім, якім хацела. Паказала замалёўку сяброўцы, яна сказала, што гэта шэдэўр і трэба яго дапісаць. Атрымаўся тэкст на 15 старонак, які я дала пачытаць настаўніцы па рускай мове. Ужо тады зразумела, што гэта не вельмі добрая работа, але педагог не хацела мяне крыўдзіць, яна сказала, што ўсё нармальна, толькі над дыялогамі варта папрацаваць.

**«Я не заўсёды наперад ведаю, чым павінен скончыцца мой фанфік. Бывае, што задумка адна, а выходзіць зусім іншае».**

Пасля першай спробы напісання любоўнай гісторыі я пачала пісаць фанфікі па серыяле «Сваты» і публікаваць іх на сваёй старонцы «УКантакце», а потым у розных суполках гэтай сацыяльнай сеткі. У мяне ўтварылася невялікае кола чытачоў, прыкладна чалавек 30, якім падабаўся гэты серыял. Яны пакідалі каментарыі — так я атрымлівала зваротную сувязь, і гэта матывавала працаваць далей.

У 10 класе пачала пісаць драбл (кароткая замалёўка з жыцця персанажаў да дзесяці старонак) па «Ранетках», па любоўнай лініі Людмілы Барзовай і Віктара Шынскага. Гераіню ў фільме іграла Алена Барзова, яна мне падабалася як чалавек і як актрыса, мне хацелася пазнаёміцца з ёй, і я вырашыла напісаць ёй у «Фэйсбуку». Яна адказала мне, што ёй спадабалася мая работа, і мы пачалі перыядычна спісвацца. Алена расказвала пра свае ўражанні, давала парады, дзівілася, што юная дзяўчына так добра можа перадаць вобраз, характар дарослай гераіні фільма.

***— Колькі работ у цябе ўжо ёсць на «Фікбуку», пра якіх персанажаў падабаецца пісаць і дзе знаходзіш час для гэтай справы?***

— На сёння апублікавана 27, некаторыя з іх скончаныя, некаторыя не, але ў працэсе. У мяне ёсць звычка — паралельна працаваць над некалькімі гісторыямі, і гэта не вельмі добра. Часам забываю, на чым я спынілася, як хацела працягнуць гісторыю, таму саджуся і перачытваю ўсё, зноўку планую развіццё падзей фанфіка.

У асноўным пішу па матывах серыяла «Хадзячыя мерцвякі» альбо па «Гары Потэру». Амаль заўсёды раблю гэта ад першай асобы — жанчыны. Аб'ём маіх фанфікаў вар'іруецца ад дзвюх да сямідзесяці старонак.

Пішу ў любы час, вельмі часта апоўначы пад сумную музыку. Мне не патрэбна цішыня. Каб натхніцца, часта пераглядаю фатаграфіі персанажаў, гляджу розныя відэаролікі, каб пранікнуцца, «злавіць хвалю». Я не заўсёды наперад ведаю, чым павінен скончыцца мой фанфік. Бывае, што задумка адна, а выходзіць зусім іншае.

**«Калі пішу, не думаю, якія падабраць словы, проста саджуся і слухаю голас унутры сябе».**

***— Што табе найперш падабаецца на «Фікбуку»?***

— Тут усе аўтары і чытачы сочаць за пісьменнасцю. Любому карыстальніку можна выпраўляць памылкі. Гэта называецца «публічная бета», у мяне яна таксама ўключана. Важна, каб работа была без памылак. Да таго ж можна атрымаць узнагароду за пісьменнасць. У мяне яна ёсць. Таксама я з'яўляюся афіцыяльнай бетай з пісьменнасцю ў 95 працэнтаў. Выпраўленне як сваіх, так і чужых недахопаў добра дапамагае мне ў маёй рэдактарскай дзейнасці. Зараз я вучуся на факультэце журналістыкі на спецыяльнасці «Літаратурная работа. Рэдагаванне» і пасля планую працаваць па ёй, мне гэта падабаецца, таму «Фікбук» — добры памочнік для развіцця прафесійных навыкаў.

***— Літаратура заснавана на жанрах — раман, апавяданне і г. д. А ці ёсць яны ў фанфіках?***

— Так. Самая папулярная катэгорыя фанфікаў — гэта анімэ і манга, а папулярны жанр — слэш (любоўная лінія «м+м»).

***— Ці думала выпусціць свае работы ў кніжным фармаце?***

— Вельмі часта! Фанаты таксама не раз прасілі зрабіць кніжны зборнік маіх фанфікаў, але, на жаль, пакуль гэта складана ажыццявіць. Любому выдавецтву патрэбна гарантыя, што кніга акупіцца, што яна спадабаецца чытачам, а такую гарантыю даць складана. Хаця ў адной знакамітай кнігі фанфікаў гэта добра атрымалася — я пра «50 адценняў шэрага». Хто ў тэме, той ведае, што першапачаткова гэта была кніга фанфікаў пра «Змярканне».

***— Алена, ці ёсць у цябе іншыя захапленні?***

— Люблю савецкія фільмы, савецкіх акцёраў. Мая любімая актрыса — Людміла Гурчанка — у свой час настолькі прыцягнула сваёй індывідуальнасцю, што я перагледзела ўсе яе стужкі (а іх больш за 120), серыялы, інтэрв'ю. Мне падабаецца, як яна сябе паводзіла, гаварыла, апраналася. Яна была асаблівай, «несавецкай у савецкім грамадстве». Калі паступала на журфак, пісала пра Людмілу Гурчанку на экзамене.

***— Як думаеш, напісанне фанфікаў — гэта назаўсёды?***

— Упэўнена. Мяне натхняе літаральна кожны прагледжаны серыял, фільм, і я пачынаю ствараць новую гісторыю персанажаў, якія мне сімпатычныя. Калі пішу, не думаю, якія падабраць словы, проста саджуся і слухаю голас унутры сябе. І таму жадаю кожнаму чалавеку знайсці «тое самае» хобі, якое будзе дастаўляць шмат добрых эмоцый і шчасця.

**Дар'я ШЛАПАКОВА,**
**студэнтка IV курса**
**факультэта журналістыкі**
**БДУ.**

*Занятак па душы*

# МІНІМАЛІЗМ НА КОНЧЫКУ ІГОЛКІ

**Анастасія СТРАЛЬЦОВА па адукацыі архітэктар, яна дзесяць гадоў адпрацавала графічным дызайнерам у Мінску. За гэты час дзяўчына рэалізавала дзясяткі цікавых праектаў. А потым вырашыла спыніцца на мастацтве... татуіроўкі.**



— Гэтая мара з'явілася ў мяне ў 15 гадоў. Тады на адным з тэлеканалаў ішла вядомая перадача «Маямскае чарніла» з шыкоўнай татуіроўшчыцай Кэт Фон Дзі. Натхніўшыся ёю, я зрабіла сабе першае тату. Але бацькі былі абураныя, калі ўбачылі маю «прыгажосць», сказалі, што «наколкі» не для дзяўчыны. Час ішоў, я скончыла архітэктурны факультэт, уладкавалася на працу. Здавалася, што справы ідуць нядрэнна, але ў 27 гадоў пачала адчуваць нерэалізаванасць, таму адважылася на кардынальныя перамены ў жыцці. Напачатку дапамогі з боку не было, вучылася мастацтву тату самастойна. Рабіла малюнкі на свіной скуры, агародніне, штучных матэрыялах.

Цікава, што Насця набівае татуіроўкі толькі па сваіх эскізах, у стылі мінімалізму, у якім, дарэчы, адчувае сябе ўпэўнена і свабодна. Адну і тую ж работу ніколі не паўтарае. На стварэнне эскізаў яе натхняюць думкі і ідэі кліентаў. Часцей за ўсё дзяўчына робіць тату на руках, сцёгнах, а вось на пальцах, вушах і ступнях — ніколі.

— Ці павінен быць сэнс у татуіроўкі?

— Лічу, што неабавязкова. Набіваючы сабе, магу прымеркаваць яе да пэўных падзей, а часам проста выбіраю тое, што візуальна падабаецца. На маім целе больш за 15 татуіровак, некаторыя ўжо ператварыліся ў адну суцэльную. У асноўным гэта кветкі і птушкі, але ёсць і незвычайныя: жанчына, у якой замест верхняй часткі галавы расліна, парная татуіроўка з мужам, малюнкі розных жывёл, рыб, ягад і выява... лямпачкі. Да сваіх кліентаў я не лезу з роспытамі аб сэнсе тату, лічу, што гэта асабістая справа кожнага.

Падчас нашай гутаркі Насця расказала, што, па яе назіраннях, дзяўчаты лепш пераносяць боль, чым хлопцы. Але абагульняць не варта, бо ў кожнага чалавека свой балявы парог: для аднаго набіваць малюнак на скуры балюча, для другога — прыемна.

Ад чаго залежыць колер татуіроўкі? Бывае, што чорны праз тыдзень-два становіцца зялёным. Як гэтага пазбегнуць? Суразмоўніца кажа, што такога быць не павінна, калі гэта здарылася, значыць, вам зрабілі тату няякаснымі пігментамі. Таму набіваць малюнак трэба ў салоне з добрай рэпутацыяй.

— Добры спецыяліст, які знайшоў свой стыль, прыйшоў да поспеху самастойна, будзе запатрабаваны заўсёды. Важна любіць сваю справу, а не проста зарабляць грошы, — дзеліцца Насця. — Напрыклад, на пачатку свайго прафесійнага шляху я разумела, што трэба развіваць навык малявання. Не ва ўсіх тату-майстроў ёсць такі прыроджаны талент, у маім выпадку ён набыты. Не лішнім будзе напомніць і пра тое, што залог паспяховай кар'еры ў наш час — добрая піяр-кампанія. Многія кліенты знаходзяць мяне праз «Інстаграм». Эскізы работ на сваёй старонцы я публікую кожны дзень, каб чалавек мог зразумець, падабаецца яму мая творчасць або не. А каб зачапіць вока патэнцыйных кліентаў яшчэ больш, раблю фатаграфіі эстэтычнымі, у адзіным стылі.

**Дар'я ШЛАПАКОВА,**
**студэнтка IV курса**
**факультэта журналістыкі БДУ.**



